## КАМЯНІ КАРФАГЕНУ, АБО ПАЎНОЧНАЯ БРАМА АФРЫКІ

Прывітаньне, Яўгенка!

Няхай не зьдзіўляе цябе гэты доўгі, разгорнуты ліст, які атрымаеш дзён празь дзесяць-чатырнаццаць. Падсумоўваю ў ім свае думкі, назіраньні, падарожныя нататкі, дзёньнікавыя запісы і тое, што кладзецца на стужку дыктафону "Sanyo" (ён фаніць, а таму карыстаюся ім зрэдку). Ліст гэты я называю для сябе індульгенцыяй, бо пачуваюся ніякавата: не пасьпеў папярэдзіць цябе з мамаю пра сваю вандроўку, хоць, здаецца, ня раз намякаў пра магчымы адʼезд у бліжэйшыя дні. Ён да апошняга моманту падаваўся малаверагодным, а таму баяўся казаць, каб не сурочыць. Дый не пакідала надзея, што пашлю тэлеграму з дарогі або здолею пазваніць. Але ў любой сытуацыі можна знайсьці станоўчае: праз сваю вінаватасьць абяцаю пісаць як мага падрабязьней. Пагатоў ты яшчэ толькі плянуеш свой летні адпачынак і, магчыма, спакусісься на экзотыку. Хоць, можа, і апрыкрала яна табе за тры гады ў Індыі?

Але хопіць інтрыгі — цяпер пра ўсё спачатку. Я еду ў Афрыку. Чаму ў Афрыку? А чаму б і не? На чорным кантынэнце я яшчэ ня быў — трэба больш ведаць сьвет.

Дочкі, як ведаеш, у мяне прыладжаныя з кузынаю на два тыдні. А тут прапаноўваюць "афрыканскую" пуцёўку, што "гарыць", а значыць, абыдзецца зь істотнымі скідкамі. Мы з Раяй досыць лёгкія на падʼём, сабралі чамадан літаральна за дзень, які "праседзелі" на тэлефоне: турагенцтва замаўляла нам месцы ў гатэлі праз польскае аддзяленьне міжнароднай фірмы "Scan Holiday",

выпраўляла страхоўкі і білеты на чартарны рэйс, а ўсё гэта трэба было ўзгадняць.

І яшчэ адну праблему трэба было сьпешна вырашаць. Дочкі завялі сярэднеазіяцкага "чарапаха", але чамусьці назвалі яго Сэмюэлем, а не якім-небудзь мусульманскім імем Саід. Дзякавалі Пецю Васючэнку, нашаму суседу з Уручча, які пагадзіўся дагледзець Сэма гэтымі днямі.

Як бывае перад ад'ездам, пасьпешліва хапаліся за даведнікі, атлясы, энцыкляпэдыі. Крыху супакоіліся, калі дазналіся, што клімат на поўначы Тунісіі, дарэчы, самай паўночнай афрыканскай краіны, — субтрапічны міжземнаморскі, а сярэдняя сутачная тэмпэратура паветра ў ліпені — 26 градусаў. Саманазва Тунісійкай Рэспублікі — Аль-Джумхурыя ат-Тунісія, во як, па-арабску мудрагеліста. (Надалей краіну буду называць Тунісіяй, каб адрозьніць ад яе сталіцы — Тунісу). А арабская мова, як ты ведаеш, адна з афіцыйных і працоўных моваў ААН. Дзіва што — на ёй гавораць у сьвеце больш за 150 мільёнаў чалавек! Чытаюць і пішуць арабы справа налева. Альфабэт налічвае 28 літараў для абазначэньня зычных і доўгіх галосных гукаў. А для абазначэньня кароткіх галосных могуць ужывацца і надрадковыя знакі, як у нашых "й" або "ў". Але вось яшчэ што ўразіла: арабы ўспрымаюцца пераважна як азіяцкі народ, а між тым іх у Афрыцы ўдвая болей — за 90 мільёнаў. А што яшчэ зьдзівіла, покуль уздымаў кніжны пыл, — рымскі пісьменьнік Люцый Апулей, аўтар раману "Мэтамарфозы, або Залаты асёл", паходзіў з Паўночнай Афрыкі і нават быў рытарам і жрацом у Карфагене. А ў сваёй "Апалёгіі" ён бараніўся ад абвінавачваньня ў магіі. Адсюль вынікала яшчэ адна філялягічная загадка. Памятаеш старога з уайльдаўскай казкі "Хлопчык-зорка", які быў адным з самых выкшталцоных і вераломных магаў

Лівіі, або, як казаў Джафар у "Алядыне": "Я вучыўся ў самых славутых магаў Магрыбу"?

Маг і Магрыб — гэта выпадковае супадзеньне? Слова "маг", аказваецца, паходзіць ад пэрсідзкага "вогнепаклоньнік", і першапачаткова азначала жраца зараастрызму. А "Магрыб" — ад арабскага "захад". Уласна "Магрыб" — гэта Тунісія, Альжыр і Марока, а Вялікі Магрыб, ці Арабскі Захад, уключае ў сябе яшчэ і Лівію, Маўрытанію, Заходнюю Сахару.

Так ці іначай, але мы мусілі кіравацца на Арабскі Захад і, зразумела, не на чароўным дыване. Апрача таго найкарацейшы шлях — не заўсёды простая лінія, а наш пралягаў праз Польшчу. Але нават калі мы нарэшце атрымалі ваўчар на Варшаву, нават калі селі ў цягнік № 103, дык ня верылі, што выправіліся гэтак хутка і авантурна.

Памятаеш, як хораша езьдзілася па чыгунцы ў дзяцінстве? Тут табе і нязвыклая абстаноўка дому на колах, і надзіва смачная гарбата, запараная з тытану, і назіраньне зь верхняй паліцы за краявідамі, што разгортваюцца за вакном. З узростам мінуліся тыя рамантыка ды ўзьнёсласьць. Нават у купэ амаль ня сплю ў цягніку. А тут яшчэ памежнікі з мытнікамі — чатыры разы за ноч — свае і польскія. Праўда, як езьдзіў першы раз за мяжу ў складзе дэлегацыі маладзёвых выданьняў (я — ад "Бярозкі", Уладзімір Някляеў — ад "Крыніцы"), палякі падаліся больш ветлівымі і памяркоўнымі за савецкіх службоўцаў. На жаль, і сёньня застаецца адчуваньне, што выяжджаеш зь лягеру сацыялізму ў сьвет капіталізму.

Выйшлі раніцою на вакзале "Warszawa centralna" і адчулі сябе ня тое, што вольнымі, а, як бы гэта дакладней сказаць, разьняволенымі. Ці заўважаў ты, што на радзіме як быццам не існуе панятку прэзумпцыі невінаватасьці, нібыта ты ўвесь час парушаеш нейкія законы, палажэньні, указы, інструкцыі і

нават ня ведаеш — якія, нібыта ўвесь час сочыць за табою неадступнае, пільнае вока? А ў той жа Варшаве пачуваесься, нібыта нікому ты непатрэбны, нікому няма да цябе клопату. Мусіць, гэтак сама камфортна і бясьпечна пачуваўся там чалавек, якога мы пазналі на пэроне. Як ты думаеш, хто гэта быў? Зянон Пазьняк! Але падысьці, перамовіцца не выпадала: надта ўжо заклапочана гутарыў ён з двума суразмоўцамі.

Намянялі злотых, запхнулі чамадан у нашпігаваную электронікай сэкцыю камэры-багажні, пасьнедалі. У прывакзальным сквэры ледзь адбіліся ад бамжоў-жабракоў, гэткіх жа, як і нашыя, дый выправіліся шпацыраваць, балазе вольнага часу мелі багата. Спачатку, праўда, заблукалі. Пайшлі па Ерусалімскай алеі, ды ня ў бок цэнтру. Вярнуліся, пайшлі па вуліцы Эміліі Плятар, па Маршалкоўскай, потым па Крулеўскай (ці Каралеўскай, хоць, мабыць, ня варта перакладаць). Горад быў крыху заспаны, але кіроўцы неадменна прапускалі пешаходаў на "зебрах". А Кракаўскае Прадмесьце (так завецца вуліца) — гэта, лічы, суцэльны музэй пад адкрытым небам. Палацы, помнікі, касьцёлы, музэі. Унівэрсытэт, касьцёл сьв. Юзафа, акадэмія мастацтваў, помнік Б. Прусу, помнік Я. Панятоўскаму, міністэрства культуры, Музэй карыкатуры, кінатэатар "Культура", а насупраць помнік Адаму Міцкевічу на баракальным пастамэнце пры кляштары кармэлітаў. Ну і, натуральна, час ад часу, здымаў на "Kodak", які ніколі не падводзіў мяне, асабліва добра схопліваючы сярэднія пляны. Потым пілі каву на Пляцы старога рынку, цягаліся па крамах (Раю зьдзівіла безьліч вырабаў са срэбра і асабліва з бурштыну. А мне чамусьці зласьліва падумалася: расейцы на ўвесь сьвет плачуцца з-за Бурштынавага пакою, а самі павывозілі з захопленага пасьля вайны Кёнігсбэргу, мабыць, сотні тонаў таго ж бурштыну!), блукалі

цеснымі завулкамі. І нават ня верылася, што ледзь ня ўвесь стары горад палякі адбудавалі пасьля вайны.

Хоць ня буду тут асабліва спыняцца. Гэта, скажам, масквічы ўспрымаюць Польшчу як замежжа (памятаю, як грунтоўна зьбіраліся на Варшаўскі кніжны кірмаш знаёмыя выдаўцы), а ў Беларусі хіба што лянівы не пабыў за апошнія гады на Беласточчыне ці па-над Віслаю.

Увечары пад’ехалі аўтобусам проста да тэрміналу № 1 міжнароднага аэрапорту, дзе нас ужо чакалі прадстаўнікі "Scan Holiday". Афармілі паперы надзіва хутка — запоўнілі невялічкія анкеткі ды пападпісвалі біркі на багаж ды ручную покладзь. Крыху зьбянтэжыла, калі на рэгістрацыі білетаў кампаніі "LOT-Polish Airlines" спыталіся ў нас, ці палім. Аказалася, што ў "боінгу" ёсьць салёны для аматараў тытуню і тых, хто да яго не ахвочы. Я ўпершыню ляцеў амэрыканскім самалётам, а таму было відавочна, што ўзровень камфорту ў ім куды вышэйшы, чым у звыклых "тушках". Тое самае тычыцца сэрвісу і харчаваньня. Сярод напояў былі ня толькі натуральныя сокі, але і піва, чырвонае віно...

Камандзір карабля з даволі пацешным прозьвішчам Жучак зьвяртаўся да пасажыраў па-польску ды па-ангельску. У начной бездані было прыемна і ўзьнёсла ўсьведамляць, што пад крыламі "B-737" застаюцца Чэхія, Славакія, Аўстрыя, Славенія, Харватыя, а пасьля Адрыятыкі — Італія і, нарэшце, Тырэнскае ды Міжземнае моры!

Пасьля прызямленьня палякі апладысмэнтамі падзякавалі пілотам за падарожжа. Ня ведаю, ці то ў аэрапорце Манасьцір кароткая ўзьлётна-пасадачная паласа, ці то нашыя пілоты лепшыя, аднак пасадка магла б быць больш мяккаю...

Якія першыя ўражаньні на афрыканскім кантынэнце? Спакусьлівае шалахценьне пальмавых лістоў на хвалях цёплага ветру і ні з чым не параўнальны водар марской солі і водарасьцяў! Чамусьці адразу згадалася мне абхаская Піцунда!

Неўзабаве здалі памежнікам анкеты, паказалі пашпарты, атрымалі багаж і пагрузіліся ў аўтобусы. Промні ліхтароў выхоплівалі з густой паўднёвай цемрадзі прыдарожныя знакі з надпісамі па-арабску і па-француску, гмахі гатэляў і жываплоты з алеандраў, акацыяў, рададэндронаў, апунцыяў і яшчэ немаведама якіх хмызьнякоў ды кактусаў.

Але захапляцца паўднёвай прыгажосьцю не было калі — прыехалі да свайго гатэлю "Saadia" на ўскраіне Манасьціру за чвэрць гадзіны дый адчулі, што стаміліся страшэнна. Апрача таго тунісійскі час розьніцца ад нашага на дзьве гадзіны, і была ўжо позьняя ноч. Але нас сустрэў начны парцье-араб і прывітаў па-француску: "Bon soir!" Мы ледзь не аслупянелі. Хоць і выхоўвалі нас (на словах) інтэрнацыяналістамі, але "homo postsovieticus" — ці не найбольшыя ў сьвеце расісты. Не адразу можам уцяміць — як гэта араб навучыўся ў школе (!) свабодна валодаць францускай?! Памятаеш, як мая, а потым і твая клясная дама, "англічанка" Соф’я Ісакаўна пераконвала вучыць ангельскую? Як недаверліва-іранічна падчас жалезнай заслоны ўспрымалі мы аргумэнт, што можам апынуцца за мяжою ды не паразумецца з тубыльцамі? А ў той вечар было не да жартаў — ліхаманкава згадваў усё, што памятаю з ангельскай. Во дзе прыдалася б твая француская!

Збольшага паразумеліся, запоўнілі анкеты, атрымалі ключы. Ліфтам падняліся з нулявога (так, мабыць, ты ведаеш, лічаць шмат дзе за мяжою) на свой другі паверх.

Ногі гулі па-воўчы. Не далі паратунку ні каменная, нават у нумары, падлога, ні халодны душ. Была адна толькі думка: "Заваліцца і спаць!"

29.06.1996 г. Раніцай тузануў цяжкія дубальтовыя шторы і адхіснуўся — такое зыркае асьляпляльнае было сьвятло! Выйшаў на лёджыю: унізе брукаваны дворык, клюмба з пальмаю, распырскваецца вада па газоне, брама з вартаўнічкаю, далей гасьцінец, пальмавыя зарасьнікі, зіхоткая палоса мора і бясконцы, чысьцюткі да млоснасьці блакіт неба.

Апрануліся адразу па-пляжнаму, хуценька пасьнедалі (швэдзкі стол — стравы выстаўленыя, і кожны набірае сабе колькі і што хоча) і хутчэй да мора! Але нават не пехатою, а ў кібітцы з надпісам "Gratis" (Калі ласка). Вазьніца — усьмешлівы тунісіец у веку. Камізэлька, чырвоная шапачка-фэска. Хударлявы, як і ягоны буланы конь. Як вераб’і і каты. Усё тут, кінулася ў вочы, як быццам бы драбнейшае, сушэйшае, чым у нас. Мабыць, гэта з-за сонца. А яно непадзельна ўладарыла на пляжы, працінаючы паветра, пясок і марскі прыбой. Сквар стаяў сухі, нерухомы, няўмольны, вар’яцкі. Можа, таму ўспомніўся Мёрсо з "Чужаніцы" Камю. Дарэчы, Зьміцер Колас, які перакладаў гэты раман на беларускую мову, працаваў колькі год з геолягамі ці то тут, ці то ў суседнім Альжыры.

Кожны гатэль мае свой кавалак узьбярэжжа. Але пляжы тут покуль што ня вельмі дагледжаныя. Спэцыфічны пах маюць водарасьці, якія дзе-нідзе гніюць цэлымі гурбамі, не стае распранальняў і душавых. А што ёсьць? Ёсьць тапчаны ды матрацы, парасоны з трысьнягу на драўляных слупах. Ёсьць пясок, настолькі дробны, што выдае ў вадзе глеем. Ёсьць мора, плыткае мэтраў на сто дый салёнае настолькі, што, здаецца, выштурхоўвае тваё цела на паверхню. Ёсьць яшчэ шмат забаваў. Можна пагуляць у біч-волей — пляжны

валейбол або заняцца віндсэрфінгам. Можна праехацца на кані або муле. Можна пакатацца на вадзяным ровары або паплаваць з аквалянгам. Паскакаць на хвалях на "банане" або праляцець па-над пляжам на парашуце, які цягне за сабою на доўгім фале катэр. Зразумела, што за ўсе гэтыя забаўлянкі трэба плаціць.

Даволі экзатычна і нязвыкла ўспрымаюцца конныя палісмэны, якія гарцуюць уздоўж прыбою на арабскіх, шэрых у яблыкі, скакунах. Настойліва прапаноўвае дыні, абрыкосы, пэрсікі, сьлівы ды вараную кукурузу хлопчык-гандляр з плеценым кошыкам. Можна спатоліць смагу і ў бары напоямі ды безалькагольным (мусульманская краіна!) півам "Celtia". Мясцовыя кабеты і дзяўчаткі купаюцца проста ў сукенках. Затое немкі ды палячкі, нават старыя, намазаўшыся крэмамі для загару, ляжаць, а то і ходзяць top-less, бязь верха.

Як ведаеш, увогуле я не вялікі аматар смажыцца на сонцы, а ў першы афрыканскі дзень — і пагатоў. Таму ўцяклі даволі рана. Дый а першай гадзіне па нас заехала на таксоўцы Ганна Баровак — pilotka-апякунка польскіх турыстаў. Нават у холе яе лёгка было пазнаць па папцы са слонікам-эмблемаю фірмы "Scan Holiday". Яна забрала нас на інфармацыйнае спатканьне ў суседні пяцізоркавы "Amir-palace". Ну, браце, скажу я табе, — гэта сапраўдны ўсходні палац, — раней падобную раскошу бачыў я хіба што ў кіно!

За кактэйлем апякунка пераказала пра асноўныя правілы для турыстаў на "фабрыцы вакацыяў", адказала на пабытовыя пытаньні, дала брашуркі, зь якіх можна было дазнацца шмат карыснага.

Пагадзіся, мы звыклі да свайго незаўважнага акружэньня. Незаўважнага, калі яно ёсьць. І прыкра бывае, калі гэтых дробязяў не стае. Маю на ўвазе буклеты, расклады, мапы, пляны, тэлефонныя даведнікі і іншую інфармацыю, якая дазваляе эўрапейцу пачувацца камфортна. Дык вось, у

атрыманым "інфарматары" можна было прачытаць агульныя зьвесткі і пра краіну, і пра яе валюту, транспарт, гастранамію, сьвяты, мастацтва, праграму экскурсіяў і нават меры бясьпекі!

Нас, вядома, абурыла, што не аказалася ў нумары тэлевізару, як нам дакляравалі. Нам патлумачылі, што ў некаторых гатэлях як за сэйф, так і за тэлевізар трэба даплочваць дадаткова. Даплаціў — па тры даляры за дзень. І не шкадаваў: дзякуючы антэне-"талерцы" прымаліся мясцовая праграма, дзьве нямецкія, дзьве французкія, гішпанская і італьянская. Але найбольш цікавілі мяне ангельскамоўныя "Eurosport", бо ішоў чэмпіянат Эўропы па футболе, і "BBC", па якой сачыў за прэзыдэнцкімі выбарамі ў Расеі. Калі не памыляюся, Чэрчыль сказаў, што дэмакратыя — найгоршая форма кіраваньня, але чалавецтва не прыдумала нічога лепшага. Хоць выйграў Ельцын першы тур, а на душы неспакойна.

А-а, у цябе, банкаўскага клерка, мабыць, заканамернае пытаньне пра мясцовыя грошы. Праблем ні з абменам, ні зь пералікам не было. Адзін даляр мяняюць тут прыблізна за 0,967 DT (тунісійскі дынар). Самыя хадавыя банкноты — па 20, 10, 5 дынараў. Прычым ходзяць як старыя, з партрэтам першага прэзыдэнта Хабіба Бургібы, якія нагадваюць хрушчоўскія аблігацыі, так і новыя, што па ўзроўні паліграфічнага выкананьня і ступенях абароны ад падробкі не саступаюць дойчмаркам. А найбольш за ўсё спадабалася мне дзесяцідынаравая — з выяваю Ганібала! Манэты ў адзін і паўдынара таксама сымпатычныя. Яны зробленыя са сплаву зь вялікім утрыманьнем срэбра. Медзь — па 200, 100, 50 мілімаў. А тысяча мілімаў — гэта 1 дынар. Самая дробная манэтка, што траплялася мне, 5-мілімавая, з арабскай вязьзю, як і астатнія, і з выяваю аліўкавага дрэва. Вывозіць мясцовую валюту катэгарычна забараняецца. Дый гэта бессэнсоўна — акрамя Тунісіі яна нідзе не

спатрэбіцца. Але, ведаю, што адзін з найлепшых сувэніраў — гэта дробныя грошы, а таму адразу ж вырашыў для сябе, што вывезу кантрабандна некалькі манэтак. Дарэчы, наконт выяваў на грошах. Дзіўна, калі ўспомніць запавет з Карану "Не ствараі сабе куміра!" ды арнамэнтальныя традыцыі ў арабскім мастацтве? І тым ня менш Тунісія, як аказалася, і праўда, ці ня самая "неісламская" краіна. Прынамсі, аніякім фундамэнталізмам тут і ня пахне! Спакойныя, разьняволеныя людзі. Ня рэдкасьць убачыць апранутую ў парыскіх буціках красуню за рулём шыкоўнага "пэжо".

Жанчыны ў вяку таксама не выглядаюць прыгнечанымі, хоць паранджу і можна згледзець дзе-нідзе ў мэдыне.

А-а, падмануўся я з гэтай мэдынай. Аказваецца, так завецца тут старая частка любога гораду з абавязковым атрыбутам — мячэцьцю. Мабыць, гэта даніна павагі гораду, куды перасяліўся з Мэккі заснавальнік ісламу Мухамэд.

Першая наша мэдына была ў Сусе, які мае пачэсны ўзрост — дваццаць шэсьць стагодзьдзяў. Вялікая мячэць, збудаваная тысячу сто гадоў таму, аказалася агароджанай глухой высокай сьцяною цытадэлі Рыбат. Але відаць было, што трапляюць ва ўнутраны дворык толькі мужчыны-мусульмане, якія, перш чым зайсьці ў мячэць, мусяць зьняць абутак. Спынялася вока і на адметным адзеньні сьвятароў-артадоксаў, што сьпявалі хваласьпеў Алаху, заклікалі да намазу.

А вось на базары (вымаўляецца як нешта сярэдняе паміж "сок" і "сук") панаваў суцэльны гармідар. Прайсьці спакойна па вузкіх вулках, дзе з абодвух бакоў крамы, крамкі, майстэрні рамесьнікаў, немагчыма. Цябе гукаюць, зазываюць, хапаюць за руку, просяць паглядзець на тавар, а яшчэ лепш — зайсьці ў краму. Гэта спачатку зьдзіўляла, потым пачало раздражняць.

Два першыя пытаньні, на якія дабіваюцца адказу, — гэта адкуль ты або якой нацыянальнасьці і на якой мове гаворыш. За любую драбязу цэны ломяць несусьветныя, потым абяцаюць добрыя скідкі і, нарэшце, саступаюць за трэць, а то і чвэрць цаны, якую прызначалі напачатку. Так тут зазвычаена. Якія асноўныя тавары? Дываны — ад самых маленькіх і простых да вялікіх і шыкоўных. Чаканка, срэбра і золата — досыць танныя. Сувэніры з камянёў (асабліва прыгожыя оніксы). Біжутэрыя нагадвае колеравай гамаю старажытнаягіпецкую. Шмат прыстойных вырабаў са скуры — абутак, сумкі, курткі. Кераміка ў бэзавых, бірузовых, блакітных тонах. Ну і, натуральна, шмат чаго для турыстаў — ад капелюша-стэтсана да пляжных пантофляў. Трыкатаж з папулярнымі "аазіснымі" матывамі: пальмы, барханы, вярблюды (дарэчы, яны тут аднагорбыя). Самая разнастайная парфумэрыя, кальяны, кінжалы, куфэркі, афрыканскія барабаны...

І амаль пры кожнай краме — цэлыя крушні камянёў. Але камянямі яны толькі выдаюць. На самрэч гэта сахарскі цуд — "ружа пустэльні", адмыслова, у выглядзе ружы скрышталізаваны пясок. Кажуць, што яна, халаднаватая навобмацак, убірае ў сябе радыяцыю, а таму ёсьць сэнс трымаць яе на тэлевізары ці кампутары. Падарыў мне парачку адзін з гандляроў у якасьці прэміі за нейкую набытую ў яго драбязу. А ведаеш, як зачапіліся? Гандляр пытаўся пра гарэлку на абмен. Я кажу: "Якая гарэлка, Алах жа забараняе табе піць!" А гэты хітрун сьмяецца ў адказ і паказвае на сваю краму: "Вось мой Алах, яна мяне корміць!.. Так, Мухамэд забараніў прававерным піць віно да надыходу цемнаты, але ён нічога не казаў пра гарэлку, джын, лікер, віскі!"

І тым ня меней зьяўляцца тут на падпітку ў публічных месцах нельга. А спажываць сьпіртное (імпартныя трункі надзвычай дарагія) можна толькі

падчас вячэры ў гатэлі, у рэстаране, у начным клюбе, на дыскатэцы або ў сябе ў нумары.

30.06.1996 г. Выяжджалі на паўдня на адпачынак, які па-польску называўся досыць пацешна — wycieczka statkiem pirackim. Хоць якія там піраты! — проста група (аўтобус) польскіх турыстаў, сярод якіх апынуліся два чалавекі зь Беларусі. Ты спытаесься, ці не пачуваліся мы самотна? Наадварот — радаваліся, што не было поруч суайчыньнікаў, а дакладней — усходніх суседзяў. Прынамсі, тыдзень ня бачыў п'яных. Памятаеш, як расказваў табе пра кніжны кірмаш у Растове? На цеплаходзе "Михаил Шолохов" гандляры наладзілі такія скокі, што завалілі барную стойку, а пад канец дыскатэкі ў Дон паляцелі з палубы плястыкавыя сталы і крэслы. Хоць гэта драбяза ў параўнаньні з выпадкам у Нью-Дэлі, пра які расказваў ты. Двое разгарачаных "new russians" купілі швайцара ў чужым гатэлі і прахалоджваліся ўначы ў басэйне ўнутранага дворыка. А на раніцу выцягвалі з басэйну двух тапельцаў!

Праўда, бачылі і мы ўчора расейцаў у Сусе. Дакладней, расіянку, што мяняла 500 даляраў перад паездкай у Сахару. Я асьцярожна спытаўся, маўляў, гэта на цэлую групу? А яна запярэчыла, што гэта ёй адной на тры дні, на джып-сафары! Дарэчы, меў толькі тыдзень, а таму мусіў адмовіцца ад гэткага падарожжа. Кажуць, што Сахара пакідае незабыўнае ўражаньне. Хоць чамусьці спачатку амаль усе лічаць, што сафары — гэта абавязкова паляваньне. Што гэта, атавізм ці мы сапраўды такія агрэсіўныя?

Але піраты мы аказаліся міралюбныя. Даехалі камфартабэльным, з кандыцыянэрам, чамусьці "мэрсэдэсам" (хоць абсалютная большасьць аўтатранспарту тут францускай вытворчасьці — "Рэно" ды "Пэжо") да порта Эль-Кантаўі, дзе швартаваліся яхты з усіх канцоў сьвету. Нас ужо чакала

шхуна "Elyssa" — копія старажытнафінікійскай. Праўда, аказалася яна з дызэльным рухавіком, таму ветразі, якія паднялі матросы, адыгрывалі хутчэй дэкаратыўную ролю. Але ўсё роўна адышліся далёка ў мора — бераг выдаваў маціцовымі пацеркамі і ледзь прыкметна азначаў, дзе канчаецца біруза мора і пачынаецца блакіт нябёсаў.

Кінулі якары — пад кілем было мэтраў восем. Ведаеш, ёсьць нейкая асаблівая асалода пакупацца ў адкрытым моры, асабліва калі даеш нырца з борта гэткай пасудзіны!

Ну а што да рыбалкі, дык пашанцавала дылетантцы, якая, злавіўшы нейкага стракатага бычка, больш спалохалася чым узрадавалася. А потым шкадавала яго, прасіла зьняць з кручка і выпусьціла небараку ў мора. Але рыба на борце была назапашаная. Яе смажылі на грылі, на вугольлі, а потым умомант умалацілі зь белым хлебам да салатаю.

Увогуле калі сьпёка за трыццаць градусаў (праўда, на моры яе амаль не адчуваеш, а ў памяшканьнях ратуюць кандыцыянэры), есьці амаль ня хочацца. Затое пад вечар згадваеш, што маеш толькі паўпансіён і сьпяшаесься на вячэру. Тут гэтаксама варта быць нелянівым і цікаўным, бо арабская кухня ня тое што адмысловая — проста фантастычная. Аматары экзотыкі налягалі на розных малюскаў, кальмараў, крывэтак ды рыбу, запечаную ў рошчыне, "мясьнікі" — на кус-кус, на пікантныя цялячыя кілбаскі або ягнячыя скабачкі з разнастайнымі соўсамі, а ласуны — на мусы, жэле, саладкаваты рыс з разынкамі, на садавіну ды печыва з арэхамі, міндалём і мёдам.

Ды што там казаць! Нават мэню, а тым болей карту вінаў можна чытаць нібыта вершы: настолькі ўсё прыгожа гучыць па-французску. Аказваецца, тунісійскія віны, асабліва ружовыя — знаныя ў сьвеце. А "Chateau Morgan" і "Magon" шырока экспартуюцца нават у Францыю ды Швайцарыю. І яшчэ што

зьдзівіла — нязвыклы разьліў. Што б ты падумаў, прачытаўшы "1/2 Magon"? Аказваецца, гэта бутэлька, удвая меншая за клясычную 0,75 літра. Не 0,33 і не 0,5, а менавіта 0,375!

Першае ліпеня 1996 г. Было нават пэўнае хваляваньне, калі выпраўляліся, зноў жа аўтобусам, у Карфагіну (так арабы завуць Карфаген). Але яно хутка ўляглося, дый дарога была няблізкая, больш за 120 кілямэтраў. Чым далей на поўнач, тым багацейшай рабілася расьліннасьць. Міналіся саляныя азёры, усё болей было аліўкавых садоў і нават лясоў: Тунісія займае чацьвертае месца ў сьвеце па экспарце аліўкавага алею. Калі паказаліся на даляглядзе адгор'і Атласаў, пайшоў дожджык. Не, пайшоў — гэта надта моцна сказана. Вецер быў вельмі моцны, гнаў хмары пылу і пяску, здавалася, зараз урэжа залева. Але замест яе толькі крышку папырскала. Больш сьмешнага дажджу ў жыцьці ня бачыў: кроплі нібыта ленаваліся падаць і кружлялі, віселі ў паветры, нібыта сьняжынкі. І што яшчэ ўразіла ў дарозе, дык гэта таксафоны. Яны стаяць пры аўтастрадзе, якая пралягае праз паўпустыню, праз кожныя тры кілямэтры, прычым з абадвух бакоў. І нікому ў голаў не прыходзіць псаваць або нявечыць іх — часы вандалаў на гэтай зямлі даўно мінуліся.

Хоць калі прасачыць храналёгію, дык да іх тут панавалі бэрбэры, фінікійцы, рымляне, а пасьля ваяўнічых германскіх плямёнаў пакінулі свой сьлед бізантыйцы, гішпанцы, туркі, арабы і, урэшце, французы. Узьнікненьне ж гораду-дзяржавы Карфагену датуюць 825 годам да нашай эры — амаль што тры тысячагодзьдзі! Нібыта заснавала горад фінікійка Дыдона (або Эліса), дачка цара Тыра. Яна чамусьці ўяўляецца мне ў выглядзе Элізабэт Тэйлар у ролі Клеапатры. Пасьля сьмерці мужа Дыдона ўцякла са спадарожнікамі і

скарбам у Афрыку і купіла зямлю ў бэрбэрскага цара Ярба. Паводле дамовы, яна магла ўзяць зямлі столькі, колькі пакрые бугаева шкура. Жанчына схітравала: нарэзала са шкуры танюткія паскі, абкружыла імі ладны кавалак зямлі і заснавала цытадэль будучага горада Бірсу, што азначае "шкура". Рымская традыцыя зьвязвае Дыдону з Энэем. У Вэргілія яна становіцца каханкаю Энэя, калі той прыехаў з разбуранай Троі. Але бог Юпітэр загадаў Энэю заснаваць Рым. Кабета ня вытрымала расстаньня і ўзышла на вогнішча, прадказаўшы Карфагену варажнечу з Рымам. Пра гэта ёсьць радкі і ў нашай хрэстаматыйнай травэстыйнай паэме "Энэіда навыварат":

Дапрэ Энэянка да Рыму,
І будзе тама ён царом.
Палепшы Чыжаўскіх харом
Паставіць каменны палаты.
Паны ж ня будуць там багаты.
Свае чыны ён завядзе.
І ўсё на водкуп забярэ.
Цяпер завернець к Карфагені
(Ў Дыдоны, відзіш, талака),
Папрэ ўволю ён смажэні,
Ад’есца з добрага быка,
Папарыцца ён там у бані,
Падпусьціць хвігля самой пані,
Закруціць моцна галаву —
На любжу прывядзе ўдаву…

Зь цеплынёю згадваў у Карфагене прафэсара Сьцяпана Хусэйнавіча Александровіча, у якога слухаў на філфаку курс лекцыяў зь беларускай літаратуры першай паловы XIX стагодзьдзя, а таксама іншую сваю выкладчыцу Фрыну Львоўну Лейтман, што чытала гісторыю мастацтваў у мастацкай вучэльні — ведаў, прынамсі, што такое архітраў і дзе ён знаходзіцца ў антаблемэнце. Прыдаліся даўнія веды.

Пачуваўся проста дзівосна ад усьведамленьня, што ацалелыя калёны і камяні пад нагамі — сьведкі найстаражытнейшай гісторыі. Нібыта судакранаесься зь вечнасьцю пры сьвяцілішчы Тофэль у гонар Баала і Тыніт, каля рэшткаў гандлёвага і вайсковага портаў, на руінах рымскіх тэрмаў, якія былі ня толькі лазьнямі, але і клюбам, і цырульняю, і бібліятэкаю адначасова. Двухпавярховы музэй падаўся мне беднаватым, хоць гэта і ня дзіўна — мэтраполіі павывозілі з былых калёніяў больш гістарычных і культурных каштоўнасьцяў, чым там засталося! А з экспанатаў чамусьці больш за ўсё ўразіла не кераміка, не скульптура і ня рэшткі калёнаў, а тры мапы Міжземнамор'я. На першай быў паказаны Карфаген у часы найбольшага росквіту і магутнасьці, калі займаў Паўночную Афрыку, Сыцылію, Сардынію і нават Паўднёвую Гішпанію, а Рым быў ледзь прыкметнаю плямкаю. Другая мапа адлюстроўвала стан напярэдадні Пунічных войнаў, калі рымскі сэнатар Катон-старэйшы пасьля кожнай сваёй прамовы заклікаў зруйнаваць Карфаген. Ну дык і зруйнавалі! Рымляне ўмелі дабівацца свайго і здабываць чужое. Дарма вялікі Ганібал выпісаў сланоў ажно з Індыі (афрыканскія не паддаюцца дрэсыроўцы) і пераходзіў Альпы, каб некалькі разоў пабіць грозных ворагаў! На трэцяй мапе панавала магутная імпэрыя, а на месцы Карфагена былі рымскія правінцыі Афрыка і Нумідыя. Sic transit gloria mundi!•

• Так мінаецца зямная слава! (лац.)

Панарама з вокнаў музэю адкрываецца проста фантастычная. А за паркам рымскіх віл, пры моры — бялюткі палац, што належыць цяперашняму прэзыдэнту Зін Эль Абідзіну Бэн Алі. Дзе ж яму жыць, як ня тут, грэх не жывіцца ад былой велічы. Праўда, нават скіроўваць аб’ектывы ў бок палацу гіды не рэкамэндуюць — стратэгічны аб’ект, табу! Нельга тут здымаць у дзяржаўных установах, паблізу вайсковых аб’ектаў, непажадана нават паліцэйскіх (у тым ліку і сымпатычных рэгуліроўшчыц), жанчын і прадстаўнікоў некаторых плямёнаў. Што да апошніх, дык можна абысьці забарону — спытаць дазволу ці зноў жа проста заплаціць.

Існуе нават паўафіцыйная такса на некаторыя паслугі. Пакаёўцы ў гатэлі трэба пакідаць 1—2 дынары на тыдзень, кёльнэру, ці афіцыянту, даюць "на чай" дынар або 5% ад кошту заказу, пры разьліках з таксоўшчыкамі прынята акругляць лічбу на лічыльніку, зразумела, на ягоную карысьць.

Гэты дробны рэкет — вымагальніцтва бакшышу зь любой нагоды — спачатку раздражняў, нават злаваў. А потым я даўмеўся, што трэба проста расслабіцца і прыняць законы краіны, у якую прыехаў, як дадзенае, інакш ня будзе аніякага адпачынку.

Ледзьве адбіліся ад гандляроў рознай драбязою (манэты, лямпы etc. — усё нібыта сапраўдныя археалягічныя рарытэты) — і праз чвэрць гадзіны ўжо шпацыравалі па пакручастых вулках мястэчка Сідзі Бусаі. Яно так завецца дзякуючы мараканскаму пілігрыму Абу Саіду Аль-Баі. Сьцьвярджаюць, што бела-блакітная архітэктура мястэчка, закампанаваная ў зеляніну прысадаў, здаўна вабіць мастакоў і літаратараў. Ня ведаю, як іншыя, а вось акварэлісты тут сапраўды раскашуюць, малюючы зарасьнікі бужмелю і празрыстыя цені кавярняў па-над бухтаю! А кава па-турэцку тут сапраўды файная! Можа, менавіта з-за яе тутэйшыя гандляры гэткія экспансіўныя?! Хоць ня варта

мазаць гандляроў адным алеем. Я зусім не апалягет гэтай старадаўняй прафэсіі, аднак у якасьці прыкладу згадаю хоць бы бацьку нашага першадрукара. Хіба не перадавы для свайго часу быў гандляр Лукаш Скарына? Уяві сабе, яшчэ тады купцу трэба было ведаць геаграфію, астраномію, мовы і фінансавыя сыстэмы суседніх краін, займацца тым, што цяпер завецца маркетынгам, а ў выпадку чаго і за зброю брацца, каб адбіцца ад злодзеяў. Бачыў бы ты, як напружана ўслухоўваюцца арабы ў незнаёмую гаворку, як старанна паўтараюць чужыя словы, імкнучыся спасьцігнуць іх сэнс!

Мушу зазначыць, што экскурсія гэтая сплянаваная ўсё ж няўдала. На сталіцу краіны ў нас заставалася ўсяго дзьве гадзіны, тым болей што прыпадалі яны на сыесту. Ну прайшлі па авэню Хабіба Бургібы, падзівіліся на францускую катэдру XIX стагодзьдзя Сэнт-Вінсэнт дэ Паўл, на браму XIII стагодзьдзя Баб эль-Бахал. Сьпехам агледзелі мячэці мэдрэсэ, палацы VIII—XIX стагодзьдзяў, рынак. На вялікі жаль, не ставала часу ні на Нацыянальны музэй Бардо, ні на Музэй ісламскага мастацтва, ні на прадмесьце Ла-Галет, дзе нарадзілася і вырасла славутая актрыса Клаўдыя Кардынале.

Дзякуючы некаторым амаль няўлоўным дробязям закралася ў голаў адна крамольная думка: можа, і някепска, што Тунісія прабыла 75 гадоў пад пратэктаратам, а фактычна калёніяй Францыі? Надала палітыка культуррэгерства няўлоўны францускі шарм і гэтаму мэгаполісу. Можа, якраз менавіта дзякуючы французам тут імкнуцца ашчаджаць традыцыі міжземнаморскай цывілізацыі ў яе элінскім разуменьні без залішняй арабізацыі, а тым болей без ісламскага фундамэнталізму...

2.07.1996 г. Усё ж стаміліся ўчора, а таму нават на пляж не выбіраліся — бавілі дзень каля басэйну. Ён разьмешчаны ў двары, літаральна за дваццаць крокаў ад гатэлю. Палова глыбокая — можна ўволю паплаваць, палова плыткая, дзе плешчуцца і гуляюць у воднае пола падлеткі. Ёсьць яшчэ і зусім цёплы круглы "жаботнік" для малечы. А зусім недалёка, за лёгкім бамбукавым плоцікам ідзе будоўля — узводзіцца яшчэ адзін корпус. І хоць арабы актыўна займаюцца турыстычным бізнэсам, дарэчы, вельмі дынамічным і прыбытковым, адносна нядаўна, гадоў пяць, посьпехі ў стварэньні інфраструктуры проста ашаламляльныя. Збудаваная сетка гатэляў, рэстаранаў, а таксама аўтастрады, аэрапорты. І ўсё гэта пашыраецца, удасканальваецца проста на вачах. А колькі новых працоўных месцаў ствараецца падчас і пасьля будоўлі! (Чаму ў нас на Беларусі амаль не раскручваецца турызм? — гэта пытаньне рытарычнае. Турыст найперш патрабуе палітычнай стабільнасьці і камфорту).

Адкрылі Тунісію як месца адпачынку скандынавы. Сёньня тут пераважаюць немцы (якія, падалося, арабам ўжо крыху апрыкралі), нямала французаў і італьянцаў, а апошнім часам і палякаў. Мне нават давялося аднаго разу пачуць як адна палячка абуралася. "А чаго гэта мясцовыя гіды не гавораць па-польску? Вунь колькі многа нас прыяжджае!" Вось так, суседзі нашы, зь якіх мы дзясятак гадоў таму кпілі як са спэкулянтаў, па-гаспадарску пачуваюцца ўжо ня толькі ў Эўропе, але і на іншых кантынэнтах. Відавочна, што ўзровень жыцьця ў іх настолькі высокі, што адпачынак у Афрыцы на два тыдні можа дазволіць сабе сям’я сярэдняй заможнасьці. Прычым едуць цэлымі сем’ямі — зь дзецьмі, унукамі. Дзеля апошніх у кожным гатэлі ўведзена нават пасада аніматара. Гэта штосьці падобнае да колішніх нашых масавікоў-забаўнікаў. І някепска ў іх атрымліваецца пацяшаць гасьцей,

асабліва малых на дыскатэцы пры басэйне. Я ўсё ж падсмажыўся, а вечаровае купаньне прыносіла хай сабе часовую, але палёгку.

А думалася пад музыку вось пра што. Дзеці цяпер маюць магчымасьцяў для разьвіцьця, навучаньня і самаўдасканальваньня значна болей за нас. Мы ў свой час толькі марыць маглі пра каляровыя тэлевізары, відэамагнітафоны, пра цацкі накшталт тэтрысаў, пра кампутарныя гульні, ня кажучы ўжо пра замежныя паездкі на мора ці ў горы! Праўда, згадалася і тое, як адзін наш літаратар гады два таму з гонарам казаў: "А я дык на поўдзень ніколі ня езьдзіў і ў моры ніколі ня плаваў! І нават ня цягне!" Яно, вядома, добра — хваліць сваё балота, але ці не хаваюцца за гэтым лянота ды сярмяжнасьць?

3.07.1996 г. Гадзіны дзьве амаль што не вылазіў з мора, а потым файна паганяў на скутэры "Ямаха". Аж пачырванела ўваччу ад салёных пырскаў! Мужная, мужчынская забава — несьціся на хвалях ды закладаць крутыя віражы! Такое адчуваньне, што пазбаўляесься нейкай непатрэбнай агрэсіі, нібыта яна выбіваецца знутры: на пясок паваліўся стомлены і нібыта спустошаны.

На таксоўцы (яны тут бел-чырвона-белыя або жоўтыя, даволі танныя, а сума выбіваецца без усялякіх каэфіцыентаў на таксомэтры) езьдзілі ў Манасьцір, заснаваны яшчэ падчас Пунічных войнаў. Уразіў Музэй керамікі, разьмешчаны на беразе ў старой крэпасьці, больш дагледжаны гарадзкі пляж. Набывалі розныя прэзэнты дахаты на кірмашы, а таксама ў супэрмаркеце "Жэнэраль", дзе кошты (дабратворны ўплыў французаў) адзначаны на цэтліках з дакладнасьцю да міліма!

І яшчэ што ўразіла — гэта неверагодная, ледзь не хваравітая ахайнасьць арабаў: вымушае быць гэткімі клімат. Каменная падлога мыецца штораніцы ня

толькі з мыйнымі сродкамі, але яшчэ і з дадаткам араматычных рэчываў. А іх тут проста бездань!

Пасьля абеду ў рэстаране "Цэнтральны" зь відам на сінюю бухту патрапілі ў парфумэрную вулічную краму. Ня ўпэўнены, што ў Парыжы могуць пахваліцца гэткім асартымэнтам — ад горнай лаванды і язьміну да "Шанэль № 5". І ўсё гэта ў разьліў любога аб’ёму! Хіба што апакаваньне магло б быць лепшым. Разгаварыліся з гаспадаром, які самаіранічна адрэкамэндаваўся "Мусьлім-алей-парафім!" Ведаў ён некалькі фразаў па-расейску і нават заявіў, што мае знаёмую ў Расеі. Паказаў нам свой нататнічак і (цесны сьвет!) аказалася, што Сьвета — мянчанка! Вось табе і маеш! А ўвогуле цяжка нас, беларусаў, ідэнтыфікуюць. Быў амаль што анэкдатычны выпадак. Увечары выйшлі на шпацыроўку. Прычапіўся на шашы аднарукі рамізьнік з сынам-падлеткам, маўляў, сядайце, пракачу. Адмаўляемся — хочам прайсьціся пехатою дый грошай ня бралі. Усё роўна сядайце, кажа, потым аддасьцё. Ну, уламаў. Селі, трэба знаёміцца. Толькі як сказалі, што беларусы, вазьніца наш па чарзе з сынам пачалі азадачана азірацца, прыгаворваючы "Bello russo, bello russo?" Аказваецца, што франкамоўныя людзі могуць падзяліць нашую саманазву на два словы і палічыць нас больш чым нясьціплымі, бо "bello" і па-француску і па-італьянску значыць "цудоўны, прыгожы". Вось так сталіся ў вачах рамізьніка "прыгожымі рускімі". Хоць самі тунісійцы імкнуцца быць ня толькі прыгожымі, але і шчасьлівымі. Ёсьць тут звычай: па-сьвяточнаму прыбраныя дзеці проста на вуліцы дораць прахожым адменна складзеныя букецікі язьміну на шчасьце. Праўда, прынята дзякаваць за гэтае пажаданьне шчасьця ня толькі на словах, але і звонкай манэтаю.

4.07.1996 г. Якая тут незалежнасьць, калі мы так зацікаўлена сочым за выбарамі ў суседняй краіне! Але, дзякаваць Богу, Ельцын перамог і ў другім туры, на другі тэрмін застаўся прэзыдэнтам. Думаю, што выбары былі ўсё ж сумленныя і расіяне зрабілі дэмакратычны выбар сьвядома пры ўсім багацьці іх сёньняшняга палітычнага спэктру. Прынамсі, у бліжэйшы час не павінна быць рэвалюцыйных катастроф.

А тубыльцаў куды больш хваляваў чэмпіянат Эўропы (!) па футболе. Мабыць таму, што ў іх, калі хто ўзначаліў краіну, дык гэта надоўга. Іхні першы прэзыдэнт Хабіб Бургіба, да маўзалею якога мы схадзілі, зноў прыехаўшы ў Манасьцір, будаваў сацыялізм трыццаць гадоў. Цяперашні, Бэн Алі, як даводзіў нам таксоўшчык Махмуд, ладзіць капіталізм і дае зарабіць найперш самім арабам.

Трэба зазначыць, што ўладу тут шануюць, прынамсі, вонкава. У любой афіцыйнай установе можна ўбачыць парадны партрэт прэзыдэнта і нацыянальны сьцяг — на чырвоным тле белы круг з чырвонымі паўмесяцам ды пяцікутнай зоркаю. Мабыць, ад такога патрыятызму да таталітарызму адзін крок: поруч Лівія зь яе лідэрам Муамарам Каддафі. Можна знайсьці прыклады і далей.

Але тут, у Тунісіі, эўрапеец пачуваецца камфортна, па-гаспадарску. У адносінах да іншаземцаў-турыстаў далікатнасьць прасочваецца ва ўсім.

Вось табе прыклад. Рая мае пашпарт на сваё дзявочае прозьвішча. Але гэта анікога не турбавала, і пытаньне нашых адносінаў — жонка яна мне, сястра або каханка — заўсёды далікатна абыходзілі: і харчаваньне ў кафэ, і пуцёўкі на экскурсіі выпісвалі на маё прозьвішча і пазначалі "на дзьве асобы" без усялякай падазронасьці і ханжаства.

KAMUNIKAT.org

Затое да сябе супрацоўнікі турфірмаў ставяцца вельмі патрабавальна і нават просяць турыстаў запаўняць анкеты паводле вынікаў вандроўкі — як ацэньваеш службы бюро падарожжаў, прылёту, гатэлю, апякунства, гідаў.

Што да апошніх, дык яны ня вельмі спадабаліся. І не таму, што ўвогуле недалюбліваю гідаў зь іх завучанымі, штампаванымі фразамі, турыстычнай статкавасьцю абавязковым пазіраваньнем на асноведзі знакамітых муроў і жорсткім часавым рэглямэнтам. Найчасьцей даводзіцца рыхтавацца да падарожжа зараней, тым болей, што таленавіты экскурсавод — вялікая рэдкасьць. Значна прыемней блукаць ды спазнаваць чужы горад самому, калі ёсьць моманты сапраўдных адкрыцьцяў.

5 ліпеня 1996 г. У наш апошні афрыканскі дзень сышлі з пляжу даволі рана — Раю апякла ў вадзе мядуза. Сыходзілі так пасьпешліва, што нават забыліся ўкінуць у мора манэткі — каб вярнуцца. Але я не шкадую — vita brevis, а ў сьвеце ёсьць яшчэ безьліч месцаў, якія трэба было б наведаць. Памятаеш, Бунін пісаў у сваіх дзёньніках, што хацеў бы аб’ехаць старадаўнія могільнікі сьвету, агледзець калыскі старажытных цывілізацыяў?

Калі я меў бы магчымасьць выбіраць, то найперш скіраваўся б у Ізраіль і ў Эгіпет, потым у Грэцыю, у Японію, а ў Італіі абавязкова наведаў бы Рым, Флярэнцыю і Вэнэцыю (дарэчы, адзін мой знаёмы перакананы, што заснавалі яе славяне і нават назва яе паходзіць ад племені вэнэдаў).

А на заканчэньне нашай тунісійскай праграмы быў фальклёрны вечар. Пабывалі ў вёсцы, дзе паглядзелі тыповую забудову, умельства ганчароў, ткачоў, чаканшчыкаў, іншых рамесьнікаў. Турысткам намалявалі хінай татуіроўкі на пальцах — ізноў жа на шчасьце. Мелі арабскую вячэру — зь вінам, брыкам і кус-кусам. А на стацыянарнай арэне —госьці тут кожнае

пятніцы — дэманстравалі сваё майстэрства музыкі, танцоры, жанглёры, факіры, а таксама вершнікі-віртуозы. Прызнаюся, ня ўразілі мяне ні славуты тунісійскі танец клубоў, што выконваецца пад канец вечара на стале, ні завучаныя ўсьмешкі стараватай этнаграфічнай танцоркі.

6.07.1996 г. Аўтобус не спазьніўся, і ў аэрапорт нас прывезьлі своечасова. Хапіла часу прайсьці ўсе фармальнасьці і нават выпіць кавы — адляталі а першай гадзіне ночы. І "Боінг" наш таксама падалі без спазьненьня. Нават ня верылася, што ўсё можа быць так гладка, без накладак. (Знаёмыя, што лялі чартарным рэйсам у Балгарыю, "прамарынаваліся" з ласкі нашай "Белавія" па шэсьць гадзін у Менску і ў Бургасе).

Калі сядзеў ва ўтульным крэсьле, думалася, што наперадзе яшчэ адзін вольны дзень у польскай сталіцы, а потым ноч у цягніку, які палякі абвяшчаюць "Варшава — Мінск Беларускі" (!), бо ёсьць у іх Мінск Мазавецкі. Думалася, што будзе шкадаваньне, што адпачынак у Афрыцы гэтак хутка, раптоўна скончыўся, як рапам скончыліся вакацыі Баніфацыя зь любімага намі ў дзяцінстве мульціка. Думалася, што прыехаўшы, зноў буду гартаць даведнікі, разглядаць мапы і са зьдзіўленьнем адзначаць маршрут сваіх вандровак, нязвыклую арыентацыю ў сьвеце — нам больш камфортна пачувацца ў цэнтры Эўропы.

Думалася, што будзе прагнуцца хутчэй пабачыць надрукаваныя фотаздымкі. Яны будуць ня толькі ілюстрацыямі ў аповедах, але і дапамогуць прыгадаць каштоўныя дэталі, якія незнарок, нібыта выпадкова, патрапілі ў кадар. Гэта як зь дзёньнікавым запісам: праз пэўны час многае з таго, што занатоўваў амаль мэханічна, пачынае зьзяць пэрлінкамі жывых назіраньняў або — наадварот — тое, што падавалася значным і вартым быць пакладзеным

на паперу, па часе выдае дробным і нікчэмным. Яшчэ раз пераканаўся, што нельга ленавацца, а тым болей эканоміць стужку. Больш за тое — варта набываць нават відавыя сувэнірныя паштоўкі пры ўсёй іхняй прылізанасьці і глянцавасьці.

А ўвогуле, калі падсумаваць убачанае і пачутае, дык ніякая гэта ня Афрыка ў клясычным ці стэрэатыпным уяўленьні (чарнаскурыя кучаравыя жыхары, савана ці джунглі і г.д.), а хутчэй Паўднёвая Эўропа плюс Блізкі Ўсход, зарыентаваныя, як я ўжо казаў, на традыцыі міжземнаморскай цывілізацыі.

Ты спытаесься, ці спадабалася мне падарожжа, і не атрымаеш адназначнага адказу. Гэта цэлы спэктар разнастайных уражаньняў. Ня стану сьцьвярджаць, што ўсё было бесклапотна і хораша. Але рызыкну зрабіць некаторыя высновы.

Нельга шкадаваць грошы на падарожжы, і калі надараецца магчымасьць, трэба езьдзіць адпачываць за мяжу. Кошты становяцца супастаўляльнымі з крымскімі, а камфорт і бясьпека — непараўнальныя (тунісійцы, занятыя ў турыстычным бізнэсе, ставяцца да эўрапейцаў як да гаспадароў). Апроч таго мы так мала ведаем, дый досыць ужо падарожнічаць з тэлевізійнай ласкі Юрыя Сянькевіча! Плюс выдатны стымул падцягнуць замежныя мовы! Тут вуха настройваецца, робіцца чуйным да пяці-шасьці моваў, і раскашуеш ужо ад адной толькі музычнасьці арабскай мовы. Зноў жа мімаволі мусіш займацца так званай народнай дыпляматыяй, даводзіць людзям, што беларусы — гэта эўрапейская нацыя і ўмеюць яны ня толькі зьбіваць паветраныя шары.

Падзеі і ўражаньні аказваюцца настолькі спрэсаваныя, што здаецца — за тыдзень пражыта цэлае жыцьцё. Добрую паслугу робіць гэтая ўласьцівасьць

kamunikat.org

чалавечай памяці ўтрымліваць усё лепшае. Забудуцца, да прыкладу, такія дробязі, што малавата было садавіны (у Менску бананы на кожным кроку — "бананавая" рэспубліка), што недзе недадалі рэшты, што былі даволі цяжкія начныя пералёты. Усё гэта напэўна перакрые адно толькі ганаровае ўсьведамленьне: я быў у Афрыцы, я кратаў камяні Карфагену, што ляжаць там зь біблійных часоў!

Карацей, упэўнены, што па прыезьдзе нам будзе пра што пагаварыць за бутэлькаю файнага чырвонага тунісійскага віна. І ня толькі пра напісанае тут (таго, пра што не напісана, як быццам бы і не было). Памятаеш, як адзін з герояў Сэлінджэра казаў, што жыцьцё — гэта тое, што ты робіш, а мастацтва — тое, што ты потым пра гэта думаеш? Паводле яго, атрымліваецца, што жыцьцё тады пражываеш нібыта двойчы ці хоць бы яскравей, багацей.

Я нанова перажываю свае афрыканскія дні і чакаю нашай, браце, сустрэчы на Лысай гары або ў Менску!

Бывай здаровы! Беражы сябе і маму!

Менск — Варшава — Манасьцір,

26.06. — 6.07.1996 г.